КАРАЛІ ХАКЕЯ

Хто з алімпійскіх чэмпіёнаў прыедзе ў Мінск?

Падчас чэмпіянату свету па хакеі на «Чыжоўка-Арэне» адбудуцца матчы групы В, у якой згуляюць зборныя Канады, Швецыі, Чэхіі, Славакіі, Нарвегіі, Даніі, Францыі і Італіі. Аднымі з фаварытаў групы, безумоўна, з'яўляюцца алімпійскія чэмпіёны — хакеісты Краіны кляновага ліста.

Хакей у Канадзе, як вядома, параўнальны з рэлігіяй — у гэтай краіне няма больш папулярнага віду спорту. Акрамя таго, менавіта канадскі Манрэаль афіцыйна лічыцца радзімай хакея. Першы матч там адбыўся ў 1875 годзе. А ўжо ў 1893-м Фрэдэрык Артур Стэнлі (генерал-губернатар Канады) набыў кубак, які ўручаўся лепшай хакейнай камандзе сярод аматараў. Сёння Кубак Стэнлі — гэта адна з самых прэстыжных узнагарод у сусветным хакеі.

З пачатку 1910-га хакей у Канадзе пачаў пераходзіць з аматарскага на прафесійны ўзровень. У тым жа годзе ўпершыню была сабрана і нацыянальная каманда па хакеі.

Да прыходу ў вялікі хакейны свет савецкай зборнай канадцы былі бясспрэчнымі лідарамі: яны выйгралі 15 чэмпіянатаў свету з 18 праведзеных. Але сітуацыя пачала мяняцца: канкурэнцыю паўночнаамерыканцам пачала складаць не толькі савецкая зборная, але і зборныя Швецыі, Чэхаславакіі, Фінляндыі.

Праблема для Канады заключалася ў тым, што лепшыя яе гульцы ўсё ж былі прафесіяналамі і права ўдзельнічаць на чэмпіянатах свету не мелі. Пазней па ўзаемнай згодзе IIHF і хакейных функцыянераў Канады і ЗША было прынята адно з самых важных рашэнняў у гісторыі сусветнага хакея — дапусціць прафесіяналаў да ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах.

За доўгую гісторыю зборная Канады мела мноства першакласных прафесіяналаў. Але толькі трое з іх здабылі званне «легенды» — гэта нападаючыя Уэйн Грэцкі, Марыа Лем'е і Стыў Айзерман. За імі назаўсёды замацаваны нумары ў зборнай. Уэйн Грэцкі з'яўляецца самым выніковым гульцом за ўсю гісторыю зборнай Канады.

У сярэдзіне 1990-х канадцы пачалі вяртаць сабе лідарства. За апошняе дзесяцігоддзе зборная атрымала перамогі на трох Алімпіядах (2002, 2010, 2014) і тры разы стала чэмпіёнам свету (2003, 2004, 2007). Цяпер зборная Канады займае трэцяе месца ў рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі хакея.

Самым прынцыповым сапернікам Канады заўсёды была зборная СССР, а сёння Расіі. У 2007 годзе ў Маскве канадцы сталі чэмпіёнамі свету, чым вельмі засмуцілі гаспадароў. У 2010-м і ў 2011-м ужо рускія «не пусцілі» канадцаў у паўфінал чэмпіянату свету. Для абедзвюх зборных Алімпіяда ў Сочы была не проста Алімпіядай. Перамагчы на галоўным турніры чатырохгоддзя, ды яшчэ і ў Расіі — больш чым прынцыповая задача для зборнай Канады.

Вынік ужо ўсім вядомы: канадцы паказалі выдатны хакей на працягу ўсяго турніру, у фінале перайгралі Шведаў — 3:0 і сталі дзевяцікратнымі алімпійскімі чэмпіёнамі.

Зборная Канады на гэтым турніры была зборнай без слабых месцаў. Цудоўныя варатары Луонга і Прайс, лепшая лінія абароны на турніры — Данкан Кіт, Шы Уэбер і Дру Даўці. 11 нападаючых зборнай уваходзяць у лік 25 лепшых бамбардзіраў сезона. Усё гэта прадвызначыла вынік алімпійскага турніру.

Галоўны трэнер зборнай Канады Майк БЭБКАК пасля перамогі заявіў: *«Мы гулялі выдатна, дамінавалі, не аддалі саперніку ні сантыметра. Мне спадабалася, як мы гулялі кожны матч. З такой камандай Канады немагчыма сапернічаць»*.

Чэмпіянат свету не з'яўляецца такім важным турнірам для канадцаў, як Алімпійскія гульні. Падчас сусветнага першынства асноўная ўвага канадскіх хакеістаў і балельшчыкаў прыкавана да плэй-оф Нацыянальнай хакейнай лігі.

Генеральным менеджарам зборнай на чэмпіянат свету-2014 прызначаны Роб Блэйк. Цяпер ён знаходзіцца на пасадзе асістэнта генеральнага менеджара ў «Лос- Анджэлесе».

Менавіта ён будзе вызначаць склад гульцоў і трэнераў, якія прыедуць у Мінск.

Пераважна ў зборнай мы ўбачым маладых хакеістаў, якія са сваімі камандамі не трапілі ў плэй-оф НХЛ. З алімпійцаў у Мінск дакладна не прыедуць Раян Гецлаф, Коры Пэры, Сідні Кросбі, Джэф Картэр, Крыс Куніц. Іх каманды будуць змагацца за Кубак Стэнлі.

Магчымы ўдзел у зборнай Джона Таварэса, Дэна Хэм'юса і Джэймі Бэна.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.21	20.02	13.41
Віцебск —	6.08	19.54	13.46
Магілёў —	6.11	19.52	13.41
Гомель —	6.10	19.46	13.36
Гродна —	6.37	20.16	13.39
Брэст —	6.40	20.14	13.34

Месяц

Першая квадра 7 красавіка. Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Іларыёна, Мікалая, Сцяпана, Яўстрата.*
К. *Міхаліны, Барыса, Генрыха, Макара, Міхала.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



НАРОДЖАНЫЯ 10 красавіка

Гэтым людзям хапае адвагі заставацца самімі сабой і даводзіць да заканчэння любыя пачынанні і праекты. Імі кіруе дух саперніцтва, яны любяць сваю прафесію, што ў спалучэнні з любоўю да незалежнасці перашкаджае ім утварыць сям'ю, але для іх вельмі важна мець побач з сабой сяброў, якія б іх разумелі.

Даты Падзеі Людзі

1833 год — пачалася вытворчасць запалак. Карыстанне агнём і ўменне яго здабываць — адна з характэрных асаблівасцяў чалавечай культуры. Аднак шматлікія спосабы атрымання агню доўгі час мелі прымітыўны характар. Толькі назапашванне ведаў у галіне фізікі і хіміі дапамагло пераадолець гэтую праблему. У першай палове XIX стагоддзя, з адкрыццём неядавітагах чырвонага фосфару, з'явіліся запалкі як найбольш зручны сродак атрымання агню. Яны павінны былі загарацца пры трэнні, таму для іх сталі вырабляць адмысловую паверхню. У Расіі першыя фосфарныя запалкі з'явіліся ў 1836 годзе і каштавалі адзін рубель серабром за 100 штук.

1847 год — нарадзіўся Джозэф Пулітцэр. У біяграфіях рэдка можна сустрэць характарыстыку «славуты журналіст», але Пулітцэр быў менавіта такім. Стаўшы ўладальнікам, выдаўцом і рэдактарам ранішняй нью-ёркскай газеты «World», ён хутка зрабіў яе адной з самых чытэльных. І справа тут была не толькі ў гучных палітычных расследаваннях, выкрыцці карупцыі і журналісцкіх сенсацыйных фактах. Пулітцэр быў не толькі таленавітым аўтарам, але і добрым прадпрымальнікам. Ён разумеў, што для прыцягнення публікі патрэбна не толькі палітыка. Пулітцэраўскім новаўвядзеннем сталі рубрыкі «спорт» і «мода», з яго падачы ў газетах сталі друкаваць карыкатуры і ілюстрацыі. Дадаўшы да сур'ёзнай інфармацыі свецкага жыцця, Пулітцэр, па сутнасці, стварыў сучасны тып газеты. Пражыўшы 65 гадоў, у кастрычніку 1911 года Джозэф Пулітцэр памёр, пакінуўшы нечаканае завяшчанне: яго апошняй воляй стала заснаванне Школы журналістыкі пры Калумбійскім універсітэце і фонду яго імя. На гэта ён пакінуў два мільёны долараў. Воля яго была выканана, і з 1917 году прэмія, названая Пулітцэраўскай, уручаецца штогод у першы панядзелак мая папячыцелямі Калумбійскага ўніверсітэта. Сціплы па амерыканскіх мерках памер прэміі — 10 тысяч долараў — не адлюстроўвае яе сапраўднага значэння. Яна лічыцца адной з самых прэстыжных узнагарод у сучаснай журналістыцы.

1944 год — 70 гадоў таму нарадзіўся (вёска Забалоцце Нясвіжскага раёна) Аляксандр Міхайлавіч Абрамовіч, праваед, дзяржаўны дзеяч Беларусі, доктар юрыдычных навук (1986), прафесар (1990), заслужаны юрыст Беларусі (1998). У 1967 г. скончыў БДУ. З 1964-га на гаспадарчай і савецкай рабоце. Працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН Беларусі, з 1988 года загадваў кафедрай у БДУ. У 1991-1992 гг. — член Камітэта канстытуцыйнага нагляду СССР. З 1992-га — старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь (з 1994-га — па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў). У 1996-2004 гг. — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аўтар навуковых прац па праблемах дзяржаўнага кіравання эканомікай, прававога статусу асобы, пытаннях феадалізму і тэорыі праватворчага працэсу.

Было сказана

Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:

«К праўдзе ўвагі не знае, не чуе,
Як змяя, чалавечая злосць!»

УСМІХНЕМСЯ

У мяне звялі мужа. Паставіла краты на вокны, змяніла замок, сяджу і думаю: «Божухна, хоць бы не вярнулі!»

Пайшоў на кухню выключыць святло. Вярнуўся з дзвюма катлетамі... Піць хачу, баюся вяртацца...

Толькі наша жанчына можа адной рукой мяшаць боршч, які варыцца на пліце, другой — выціраць пыл; адным вокам сачыць за дзецьмі, другім — за серыялам, нагой мыць падлогу і пры гэтым, падтрымліваючы тэлефон плячом, казаць сяброўцы:

— Не, я абсалютна не занятая!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 21.707. Індэкс 63850. Зак. № 1508.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 красавіка 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12